УДК 821.161.3

*Садко Людміла Міхайлаўна*
*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Брэст*

# МАТЫЎ ЧАСУ Ў ВЕРШАХ А. КУЛЯШОВА 1970-Х ГАДОЎ

***Анатацыя**. У вершах А. Куляшова 1970-х гг. цэнтральнымі матывамі з'яўляюцца матывы часу, руху, хуткасці, змены гадоў і вякоў (вершы «Хуткасць», «Адзіны серп на сённяшнім жніве», «Мой Новы год», «Карусель»).*

***Ключавыя словы**: матыў, матыўны комплекс, А. Куляшоў, час, рух, хуткасць.*

***Abstract**. In A. Kuleshov's poems of the 1970, the central motifs are the motifs of time, movement, speed, the change of years and centuries (poems «Speed», «A single sickle at today's harvest», «My New Year», «Carousel»).*

***Keywords**: motive, motive complex, A. Kuleshov, time, movement, speed.*

Вядома, што «матыў» адносіцца да ліку дыскусійных і шматзначных тэарэтычных паняццяў. У рускім літаратуразнаўстве у працах А. Ве-сялоўскага, В. Фрейдэнберг, У. Пропа, В. Шклоўскага, Б. Тамашэўскага распрацаваны розныя канцэпцыі матыва.

У рамках параўнальнага метаду тэорыя матыва разглядаецца ў сувязі з паэтыкай сюжэту. А. Весялоўскі вызначаў сюжэт як камбінацыю матываў: «Под мотивом я разумею формулу, образно отвечающую на первых порах общественности на вопросы, которые природа всюду ставила человеку, либо закрепляющую особенно яркие, казавшиеся важными или повторяющиеся впечатления действительности. Признак мотива – его образный одночленный схематизм» [1, с. 305]. В. Халізеў, адносячы само слова «матыў» да музыказнаўства, кажа пра тое, што зыходнае значэнне гэтага літаратуразнаўчага тэрміна паддаецца вызначэнню з цяжкасцю. Аднак мы чытаем у яго кнізе «Тэорыя літаратуры» наступную дэфініцыю: «Мотив – это компонент произведений, обладающих повышенной значимостью (семантической насыщенностью). Он активно причастен теме и концепции (идее) произведения, но им не тождественен» [2, с. 164].

Асэнсаванне часу як філасофскай і гістарычнай катэгорыі, інтымнае перажыванне часу, спроба знайсці магчымасці прымірэння чалавека з няўмольнай хадой жыцця – гэта цэнтральныя матывы ў зборніку «Хуткасць» А. Куляшова (кніга апублікаваная ў 1976 г.).

Зразумела, што да А. Куляшова ўжо існавала распрацаваная ў беларускай і сусветнай літаратуры паэтычная традыцыя спасціжэння хуткацечнасці зямнога існавання, праблем часу і вечнасці, магутнага лёсу. Крытыкі, што адгукнуліся рэцэнзіямі на зборнік «Хуткасць», адзначаюць ў вершах позняга перыяду творчасці А. Куляшова асаблівыя рысы, і вызначаюць, што паэт засяродзіўся і на выяўленні катэгорый «інтымнага» часу, паэтавага веку, эпохі асабістага жыцця на парозе значнага (60-гадовага) юбілею, пакутлівага ўздзеяння ўзроста, і на асэнсаванні «сацыяльнага» хронасу, падзей перыяду былога ліхалецця, дынамічных змен новай гістарычнай эпохі.

Так, І. Шпакоўскі адзначае, што А. Куляшоў паставіў сабе задачу «ісці ўпоравень *з векам* (Тут і далей вылучэнне аўтара. – *Л. С.*), а то і дамагчыся, каб твае творы дагналі «*век* імклівы, як прамень»« [3, с. 3]. М. Тычына трапна заўважае своеасаблівыя дамінанты куляшоўскіх вершаў 1970-х гг.: «чытаеш радок за радком, верш за вершам і адчуваеш, як непрыкметна напаўняюцца канкрэтным, куляшоўскім сэнсам гэтыя абстрактныя паняцці: *«хуткасць», «час», «быццё»*...» [4, с. 5]. Р. Бярозкін лічыць, што «*хуткасць* для Куляшова – сінонім нашага, як ніколі, зменлівага *гістарычнага часу*, з якім моваю сваіх перажыванняў, пачуццяў, думак размаўляе паэт. Новая яго кніга ўся, па сутнасці, пра наш *дынамічны* свет і пра месца паэта ў ім» [5, с. 26].

Гэтыя выдатныя навукоўцы адзінагалосна вызначаюць праблему часу галоўнай у мастацкім свеце твораў зборніка «Хуткасць» А. Куляшова. У 13-ці вершах зборніка паэт бездакорна выконвае свой запавет, што выказаны ў загалоўным вершы «Хуткасць» (1974): «Сабрат мой па пяру, на суд іх смела / Вынось усё, што ў сэрцы набалела» [6, с. 6]. У гэтым аднайменным назве зборніка вершы завяшчанне-загад тычыцца не толькі мастакоў слова, але і кожнага чалавека, над якім дзейсніцца адвечны закон часу, уладарыць дзень, век і эпоха:

Перад сабой і светам будзь праўдзівы.  
Прымай, як дар, жыццём пасланы дзень,  
І, можа, кніга гэта век імклівы  
Дагоніць і абгоніць,  
як прамень [6, с. 6].

М. Тычына адзначае: «Адчуванне хуткаплыннасці жыцця ў апошні перыяд творчасці Куляшова абвострана-напружанае: “Старэючы, і я сачу з трывогаю за часам, што мяне перажыве”. Час для яго небезназоўны, бо гэта час пакалення, пра якое паэт гаворыць: “маё пакаленне адно з першых на высокай мяжы савецкіх дзён”, “пакаленне нашае вайсковае на пік стагоддзя кінуты дэсант”» [4, с. 5].

Светапоглядная канцэпцыя А. Куляшова, выказаная ў вершах 1970-х гг., дэманструе сваё стаўленне да праблемы часу, якое выяўляецца ў спробе перадаць працэс яго менавіта ўнутранага, суб'ектыўнага перажывання. Амаль ў кожным вершы лірычны герой – альтэр-эга самога паэта, мае той жа ўзрост, біяграфію, звычкі, займаецца перакладамі, піша лісты да канкрэтных людзей, з якімі сябруе і сам А. Куляшоў.

Лірычны герой верша «Адзіны серп на сённяшнім жніве» (1973) з горыччу ўсвядомлівае, што «не вечна ўсё пад месяца сярпом» [5, с. 9], што «след пакрыла забыццё травою няўмольнаю» [6, с. 9], сочыць «за часам, што мяне перажыве» [6, с. 10]. Верш выступае беларускім інтэлектуальным парафразам цэлага шэрагу твораў, галоўным матывам якіх з'яўляецца мудрае асэнсаванне хуткаплыннасці жыцця. А. Куляшоў стварае сваю інтэрпрэтацыю вядомага лацінскага выразу Nil novi sub luna (нічога новага пад месяцам), а таксама ўскосна цытуе верш М. Карамзіна «Опытная Соломонова мудрость, или Выбранные мысли из Екклесиаста»: «Ничто не ново под луною», а таксама ўступае ў вершаваны дыялог з мудрасцю біблейскага Эклезіаста «Что было, то и будет; и что делалось, то и будет делаться, и нет ничего нового под солнцем» [7].

А. Куляшоў стварае атмасферу экзістэнцыйнага «пераходнага» часу, калі лірычны герой на парозе зусім сталага ўзросту (мой след, што пяцьдзесят гадоў назад / Знаёмы быў з вясёлай сцежкай школьнаю» [6, с. 10]) востра адчувае няўмольнасць ракі часу, выкарыстоўвае лексемы «заглух», «забыццё», «не свеціць», «змрочнасць», «не вечна», «старэючы», «трывога». Але апошнія радкі верша, клічныя па інтанацыі, валодаюць жыццесцвярджальным пафасам:

Тут месяц ні пры чым. Няхай плыве
Ягоны серп над палявой дарогаю –
Адзіны серп на сённяшнім жніве! [6, с. 10]

У гэтым урыўку актуалізуюцца вобразы вечнага руху месяца, дарогі, што звыкла атаясамліваецца з дынамікай перамяшчэння, а таксама вобраз жніва, адзін з самых светлых і жыццядайных. Згодна хрысціянскай дактрыне, жатва шматзначна сімвалізуе «1) радость от получения результатов ответственного вложения времени и труда; 2) реализация заложенной в творении цели, то есть плодоносности; 3) возможность для выражения Божьей славы, в том числе для евангелизации идущего к погибели мира; 4) Божье благословение идущих за Ним и суд над непослушными; 5) возможность одновременно и вознаграждения человека за труд, и проверки его нравственного и духовного состояния; 6) завершение процесса, который должен продолжаться определенное время» [8, с. 384].

Прыцягвае ўвагу частотнасць выкарыстання ў вершах зборніка «Хуткасць» лексем тыпу «год» (16 разоў), «дзень» (11 разоў), «час» (3 разы), «век» (2 разы), а таксама адзінкава сустракаюцца словы «тыдзень», «хвіліна», «пяцігодка», «квартал», «сезон», «тэрмін», «тысячагоддзе», «зіма», «вясна», «восень», «люты», «сакавік», «гадзіннік», «памяць», «патомкі» і г. д.

Матыў часу глыбока распрацаваны і ў вершы «Мой Новы год» (1974), дзе ў назве перадаецца гульня слоў: Новы год – пачатак календарнага года і асабісты новы год чалавека, што сустракае Дзень народзінаў. А. Куляшоў нарадзіўся 6 лютага, на пачатку года, аб чым і гаворыць герой верша, што святкуе свой юбілей:

І я не ў крыўдзе, што пачаўся з лютага
Мой новы год, якому шэсцьдзесят [6, с. 32].

Верш пабудаваны з пяці асобных частак, пазначаных лічбамі, кожны эпізод – распрацаваная замалёўка, разважанне аб хадзе часу, чалавечым жыцці, філасофскі роздум аб рацэ гадоў і дзён.

Сэнсавая прастора верша «Мой Новы год» утвараецца на перасячэнні двух досыць традыцыйных інтэрпрэтацый матыва часу. Адна, экзістэнцыяльная, сацыяльна-гістарычная, ідзе зноў-такі ад «Эклезіяста», дзе асэнсоўваецца вечны тлум, кругаварот падзей зямнога жыцця. Другая канатацыя, творча-анталагічная, – выходзіць з гарацыянскай традыцыі «Non, omnis moriar...» («не, увесь не памру»). А. Куляшоў разважае пра тленнасць, хуткаплыннасць усіх спраў чалавечых, усяго, што ўласціва гістарычнаму працэсу, «календарнаму» году: «А толькі ён і кружыцца, і свеціцца, / І запрашае ў карагод другіх [6, с. 32], пільна ўглядаецца ў будучыню, каб знайсці адказ на пытанне: «Хто ты, мой год? Завеі лютай брат / Ці ручая, сакавіком раскутага? [6, с. 33].

Пры гэтым у разрад чалавечых спраў, спраў мастака, ваяра, ўключаецца і тое, што застаецца ў вечнасці: гераічная барацьба за радзіму «пакалення нашага вайсковага» [6, с. 33], памяць аб загінуўшых, каб «ніводнага / Ты забыццю сляпому не аддаў» [6, с. 33]. Матыў часу падмацоўваецца вобразам успамінаў як важнай і важкай працы бессмяротнасці, якую павінен выконваць кожны чалавек:

Мой год, нам трэба даражыць хвілінамі.
Для нас гадзіна – тэрмін немалы.
Ужо не абрусамі, а ўспамінамі
Сталы засланы. Доўгія сталы [6, с. 34].

Усе мары лірычнага героя – пра святло, веснавыя ручаі, сонца, пра няспынны рух жыцця:

Звіняць пад сонцам ручаі, гатовыя
Тваe трывогі несці па жыцці,
Каб з імі век агорац наш і ў новае
Тысячагоддзе рэкамі плысці [6, с. 36].

У гэтых апошніх радках прысутнічае і нейкая асаблівая радасць, дакладней, нейкае святло, далучэнне да вечнасці.

Вядома, што ў апошнія дні свайго жыцця, на пярэдадні чарговага Дня нараджэння, А. Куляшоў стварыў некалькі твораў: «пад вершам "Карусель" значыцца памета: "3-га лютага"» [10, с. 459]. У апошнім сваім вершы паэт узгадвае дзіцячы атракцыён:

Гоман грамады, як на вяселлі, –
Не забыць мне вас, маленства святы,
Іскры, бляскі, рытмы каруселі.
Коні, коні, мары парыванне,
Ваш стракаты рух замкнёны колам [9, с. 104].

Вобраз каруселі сустракаецца ў многіх аўтараў – ад дзіцячых пісьменнікаў да філосафаў. Адна з прычын актыўнасці гэтага вобразу крыецца ў яго сімвалічнасці і філасафічнасці. Герой верша А. Куляшова бачыць прывабнасць гэтага атракцыёну ў руху, у мільганні фарбаў («шэрай, варанои, чырвонай масці», «коні масці варанои, мышастай», асоб («музыкі», «кентаўры», «страхоцце», «здані», «салдаты»), разнастайных прадметаў («сёдлы», «бляшанкі піражных», «літаўры», «тачанкі»). Яго цешаць усмешкі дзяцей, музыка, шум і рух. Але за гэтым апісаннем крыецца глыбокая філасофская ідэя, якая вызначае супярэчлівасць успрымання паэтам выявы каруселі. З аднаго боку, у вершы перададзеныя надзея і памкненні дзяцінства, вера ў будучыню; з другога – у тэксце адчувальны вопыт дарослага, вельмі сталага чалавека: не ўсе надзеі спраўджваюцца, не ўсе памкненні выніковыя, кручэнне бязмэтнае, а шлях па крузе вядзе ў нікуды:

Каруселі кружаць, а дзяцінства
Убаку стаіць маё – і плача [9, с. 104].

Як сведчыць С. Украінка пра асаблівасці апошняга верша «Карусель» А. Куляшова, «лірычны герой падсвядома імкнецца ўвайсці ў яго рытм, зліцца з яго рухам, але разам з тым ён выразна адчувае і ўсю недасяжнасць сваіх парыванняў, перажывае пачуццё адрынутасці, выключанасці з працэсу» [11, с. 7].

Такім чынам, матыў часу мае глыбокую філасофскую распрацоўку, адзначаецца значымасцю, стабільнасцю і паўтаральнасцю ў вершах паэта 1970-х гг.

Акрамя таго, матыў часу фарміруецца ў позняй творчасці паэта ў залежнасці ад кантэксту эпохі (дынамізм сучаснага жыцця, змены сацыякультурнага характару, нарастаючая часовая дыстанцыя ад эпахальных падзей Вялікай Айчыннай вайны) і павінен вывучацца ў прамой сувязі з ментальнымі ўстаноўкамі сталага чалавека, яго псіхалогіяй: «нясу, як ранец за спіной, здалёку я / Аж шэсць дзесяткаў спакаваных зім» (верш «Парада сабе самому», 1973) [6, с. 15].

ЛІТАРАТУРА


1. Веселовский, А. Н. Поэтика сюжетов / А. Н. Веселовский // Веселовский, А. Н. Избранное. Историческая поэтика / А. Н. Веселовский. – М. : РОССПЭН, 2006. – С. 535–573.
2. Хализев, В. Е. Теория литературы / В. Е. Хализев. – М. : Высш. шк., 1999. – 240 с.
3. Шпакоўскі, І. Сувязь з часам і людзьмі / І. Шпакоўскі // Звязда. – 1977. – 7 чэрвеня. – С. 3.
4. Тычына, М. Запавет / М. Тычына // Літаратура і мастацтва. – 1978. – 13 кастрычніка. – С. 5.
5. Бярозкін, Р. Новая кніга А. Куляшова / Р. Бярозкін // Беларусь. – 1977. – №2. – С. 26–27.
6. Куляшоў, А. Кніга паэзіі. Хуткасць / А. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 256 с.
7. Экклезиаст [Электронный ресурс] // Православный портал «Азбука веры». – Режим доступа: https://azbyka.ru/biblia/?Eccl.1&r. – Дата доступа: 12.07.2023.
8. Словарь библейских образов : [справочник] / под общ. ред. Л. Райкена, Дж. Уилхойта, Т. Лонгмана III ; ред.-консультанты : К. Дюриес, Д. Пенни, Д. Рейд ; [пер. : Б. А. Скороходов, О. А. Рыбакова]. – СПб. : Библия для всех, 2005. – 1423 с.
9. Куляшова, В. Лебядзіная песня Аркадзя Куляшова / В. Куляшова // Роднае слова. – 2000. – №9. – С. 104.
10. Гурская, А. С. Куляшоў Аркадзь / А. С. Гурская, Я. І. Клімуць // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. Т. 3. Івашын. – Кучар / Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН Рэспублікі Беларусь ; Беларуская энцыклапедыя ; пад рэд. А. В. Мальдзіса. – Мінск, 1994. – С. 459–460.
11. Украінка, С. С. Імклівы рух драўляных коней… / С. С. Украінка // Літаратура і мастацтва. – 2001. – 15 чэрвеня. – С. 7.